Г. У. Чумакова

# І УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД І ЯГО РОЛЯ Ў ГІСТРЫІ БЕЛАРУСІ

*Разглядаюцца ўмовы склікання І Усебеларускага з'езда і яго значэння для практычнага выпашэння пытання беларускага дзяржаўнага самавызначэння.*

Ідэя склікання з'езда прадстаўнікоў ад беларускіх губерняў узнікла яшчэ вясной 1917 г. Пра намер яго правядзення было заяўлена беларускімі нацыянальнымі дзеячамі на нарадзе ў Маскве ў верасні 1917 г. Ажыццявіць ідэю дзяржаўнага самавызначэння Беларусі паспрабавалі прадстаўнікі беларускіх нацыянальных арганізацый: Вялікай беларускай рады (далей – ВБР) (выступала за незалежную дзяржаву) і Беларускага абласнога камітэта (далей – БАК ) (выступаў за аўтаномію ў складзе Расіі) у снежні 1917 г. на І Усебеларускім з'ездзе. Ён павінен быў адкрыцца 5 снежня 1917 г. у Мінску, але змог сабрацца ў поўным складзе толькі 15 – 18 снежня, калі і пачаў абмеркаванне галоўнага пытання – арганізацыі краёвай улады і праблемы самавызначэння беларускага народа. На з'езд прыехалі 1872 дэлегаты, у т.л. 1167 з правам рашаючага голасу. З'езд заслухаў даклад А. Бонч-Асмалоўскага па зямельным пытанні, але адзінай пазіцыі па ім не выпрацаваў, адклаўшы яго вырашэнне надалей. Асноўная ж барацьба разгарнулася па формах нацыянальна-дзяржаўнага самавызначэння Беларусі і яе ўзаемаадносінах з Расіяй. З'езд прызнаў права беларускага народа на самавызначэнне і дэмакратычную форму кіравання. На ім выявіліся сур'ёзныя разыходжванні ў светапоглядзе і палітычных поглядах яго ўдзельнікаў, у прыватнасці паміж членамі беларускай сацыялістычнай грамады і прыхільнікамі БАК. Так, калі першыя выступалі за шырокую аўтаномію і нават незалежнасць, другія прытрымліваліся курса на захаванне саюза з Расіяй. На з'ездзе былі абраны яго Рада з 71 прадстаўніка розных партый і выканкам Рады. Пасля доўгіх дыскусій у ноч з 17 на 18 снежня была прынята рэзалюцыя: «Основываясь на своем праве на самоопределение, объявленном Российской Революцией, и утверждая демократический и республиканский строй в границах Белорусской земли, для спасения родного края, и предотвращения его раздела и отрыва от Российской демократической федеративной республики, I Всебелорусский съезд постановляет: незамедлительно создать из состава съезда орган краевой власти в лице Всебелорусского Совета крестьянских, солдатских и рабочих депутатов, который временно становится во главе руководства краем, вступая в деловые сношения с Центральной властью, ответственной перед Советом рабочих, крестьянских и солдатских депутатов». Першапачаткова бальшавіцкія дэпутаты прымалі ўдзел у з'ездзе, аднак пасля прыняцця ім рэзалюцый, не прызнаваўшых легітымнасць улады бальшавікоў, пакінулі сход. З'езд не паспеў завяршыць сваёй работы, бо быў разагнаны ў ноч на 18 снежня 1917 г. па загаду СНК Заходняй вобласці і фронта. Сілавая акцыя бальшавікоў супраць І Усебеларускага з'езда моцна падарвала давер беларускіх нацыянальна-палітычных сіл да савецкай улады. 18 снежня 1917 г. на падпольным пасяджэнні быў утвораны выканкам рады Усебеларускага з'езда, які стаў палітычным цэнтрам арганізацыі барацьбы супраць савецкай улады ва Усходняй Беларусі. А заключаны 3 сакавіка 1918 г. Брэсцкі мір, у адпаведнасці з якім Германія і РСФСР, не дапусціўшы да ўдзелу ў перамовах прадстаўнікоў Беларусі, падзялілі беларускія землі, стаў апошняй кропляй. Савецка-германскае пагадненне канчаткова пераканала лірадаў нацыянальнага руху ў неабходнасці стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Спробай ажыццяўлення гэтай ідэі стала абвяшчэнне ў сакавіку 1918 г. Беларускай Народнай Рэспублікі. Такім чынам, І Усебеларускі з'езд быў распушчаны не за спробу рэалізаваць права беларускага народа на самавызначэнне, а за спробу ліквідаваць савецкую ўладу і адхіліць бальшавікоў ад кіраўніцтва краем.

## *Спіс літаратуры*


1. Кукса, А.Н. Первый всебелорусский съезд (5 – 17 декабря 1917 года) в истории белорусско-украинских отношений/ А.Н. Кукса // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки: научно-теоретический журнал. – 2008. – № 1. – С. 23 – 27.
2. Третьяк, С. Октябрь 1917. Как большевики брали власть на белорусских землях/ С. Третьяк [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://eurasia.expert/oktyabr-1917-kak-bolsheviki-brali-vlast-na-belorusskikh-zemlyakh/. – Дата доступа: 27.02.2018.


*Чумакова Анна Владимировна*, студент ФИТиУ БГУИР, cchumakova@mail.ru
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент.